Nacionalinė švietimo agentūra

2026

# BALTARUSIŲ TAUTINĖS MAŽUMOS GIMTOJI KALBA IR LITERATŪRA

Valstybinio brandos egzamino II dalies užduotis
Pagrindinė sesija

2026 m. birželio 17 d. Trukmė – 4 val. (240 min.)

**NURODYMAI**

1. Gavę užduoties sąsiuvinį ir atsakymų lapą, pasitikrinkite, ar juose nėra tuščių lapų arba kito aiškiai matomo spausdinimo broko. Pastebėję praneškite egzamino vykdytojui.
2. **Atsakymų lape įrašykite savo identifikavimo kodą, grupę, vietą (eilės numerį protokole) ir pasirašykite.**
3. Atsakymų lape atsakymus rašykite tik jiems skirtose vietose. Už ribų parašyti atsakymai nebus vertinami.
4. Saugokite atsakymų lapą (neįplėškite ir nesulamdykite). Sugadintuose atsakymų lapuose įrašyti atsakymai nebus vertinami.
5. Atsakymus į užduoties klausimus ir rašto darbą pirmiausia galite rašyti užduoties sąsiuvinyje. Jei neabejojate dėl atsakymo, iš karto rašykite atsakymų lape.
6. Pasilikite pakankamai laiko rašto darbui perrašyti į atsakymų lapą, jeigu pirmiausia rašote juodraščiui skirtose vietose. **Vertintojams bus pateikiamas tik atsakymų lapas!**
7. Atsakymų lape rašykite **tik juodai arba mėlynai** rašančiu rašikliu tvarkingai ir įskaitomai. Atsakymų lape nesinaudokite trintuku ir koregavimo priemonėmis. Jei savo atsakymą ir (ar) sprendimą keičiate, nubraukite jį ir aiškiai užrašykite naują.
8. Atlikite testą (1–19 užduotis) ir atsakymus perrašykite į atsakymų lapą.
9. Parašykite ne mažiau kaip 300 žodžių apimties rašto darbą, kaip numatyta Kalbų valstybinių brandos egzaminų užduočių apraše. Atsakymų lape suskaičiuokite rašto darbo žodžius ir paraštėje nurodykite minimalaus žodžių skaičiaus (300 žodžių) ribą. Už trūkstamą rašto darbo apimtį vertinant bus atimami taškai.
10. Visame darbe neturi būti užrašų ar kitokių ženklų, kurie leistų atpažinti darbo autorių (pavyzdžiui, vardo, pavardės, mokyklos ir kt.).
11. Pasibaigus egzaminui, užduoties sąsiuvinį galite pasiimti.

Linkime sėkmės!

© Nacionalinė švietimo agentūra 

**TESTAS** (*30 taškų)*

**Прачытайце тэксты А і Б і выканайце заданні 1–19.**

**Тэкст А**

**Сонечны гараскоп Чурлёніса**

Чурлёніс… Аднойчы пачутае, гэта імя ўжо назаўсёды застаецца, як дзіўны акорд, у вашай свядомасці.

Назаўсёды застаюцца ў вашай свядомасці аднойчы ўбачаныя творы Мікалоюса Канстанцінаса Чурлёніса, яго “Ісціна” і “Спакой”, яго “Дружба”, “Смутак” і “Рэкс”. Запамінаюцца, застаюцца назаўсёды – як пачутыя ў дзяцінстве казкі ці як убачаныя аднойчы незвычайныя з’явы прыроды: шаравая маланка, паўночнае ззянне, сонечнае зацьменне.

Аднойчы, будучы на поўдні, я назіраў адвячоркам, пад ціхі плёскат мора, як у выніку ўзаемадзеяння промняў заходзячага сонца і аблок на небасхіле ўзнікла цэлая казачная краіна – з гарамі і далінамі, з дамамі і вежамі, з шырокай звілістай дарогай і адыходзячымі ад яе ва ўсе бакі сцяжынамі-атожылкамі. Зачараваны, захоплены, я не мог адарваць вачэй ад відовішча. Было такое адчуванне, быццам я падарожнічаю ў нейкай незямной, шматмернай прасторы і адкрываю для сябе антысвет, двайніка нашай зямной цывілізацыі.

Я потым доўга знаходзіўся пад уражаннем ад свайго незвычайнага “падарожжа”. Яно запомнілася мне назаўсёды.

Нешта падобнае зведваеш і пры знаёмстве з Чурлёнісам. Яго карціны – своеасаблівае запрашэнне да падарожжа ў нейкі іншы, нетутэйшы, ахутаны вялікай тайнай свет, на іншы, супрацьлеглы бераг. У гэтым перш за ўсё іх незвычайнасць, гэтым перш за ўсё, мабыць, вытлумачваецца сіла іх уздзеяння.

Ды вось што – неабходна адразу агаварыцца – характэрна: як бы высока ні ўзлятала муза Чурлёніса, як бы ні лунала яна, яна, – сведчыць пераважная большасць яго карцін, – не парывае з родным гняздоўем, з зямной глебай. Свет Чурлёніса, пры ўсёй яго незвычайнасці і непараўнанасці, не халодны, не чужы для нас, а, наадварот, ён дыхае жыццём, прываблівае, абнадзейвае. Яно і зразумела. Яго вялікі дар чуйны і жыватворчы.

У роздуме над “загадкай” Чурлёніса прыходзіш і да наступнай высновы. Ёсць нямала вызначэнняў генія і геніяльнасці. Зыходным крытэрыем тут можа быць і мера задаволенасці светам, адпаведна з якой геніяў можна падзяліць умоўна на два тыпы. Адны а іх, накшталт таго ж Гётэ, у асноўным задаволены светам і бачаць сваю задачу, сваё прызначэнне ў тым, каб яго далей абжываць, удасканальваць, рабіць лепшым. Другія, напрыклад, Леанарда да Вінчы, Ван Гог, Леў Талстой, больш крытычныя ў сваім

стаўленні да свету і па-максімалісцку парываюццаператварыць яго на свой лад, па сваім вобразе і падабенстве. Выяўляючы свой ідэал, яны звяртаюць позірк да новых вымярэнняў, да зорак, да космасу. Да апошніх трэба аднесці і Чурлёніса. У гэтым сэнсе сімптаматычная яго няздзейсненая да канца задума стварыць са ста карцін цыкл на тэму "Стварэнне свету". Паказальная ў гэтым сэнсе ўся яго творчасць. Як і належыць дэміургу[1], Чурлёніс творыць смела і мэтанакіравана, крута "замешвае", сінтэзуе ў якасці "будаўнічага матэрыялу" ўсё – ніз і верх, фарбу і гук, колер і штрых, рэальнасць і фантасмагорыю, мікракосм і макракосм. Універсальнасць – вызначальная асаблівасць творчага генія Чурлёніса.

Натуральна, што яго мастацтва вытрымала і працягвае годна вытрымліваць выпрабаванне часам, што яго прарочыя касмічныя фантазіі захоўваюць сваю мастацкую каштоўнасць…

*Паводле А. Вярцінскага*

**Пытанні да тэксту А**

**1.** Назавіце жанр тэксту.

________________________________________________________

*(1 бал)*

**2.** У чым, згодна тэксту, выяўляецца адметнасць карцін М.К. Чурлёніса?

________________________________________________________

________________________________________________________

*(1 бал)*

**3.** Якія з карцін М. К. Чурлёніса, згодна тэксту, назаўсёды застаюцца ў памяці? Упішыце 4 назвы твораў мастака.

**1)** _______________ **2)** _______________ **3)** _______________ **4)** ___________

*(2 балы)*

[1] Дэміург (ад грэч. demiurgos) – творца, той, хто вырабляе рэчы, работнік, майстар, рамеснік, знаўца, спецыяліст, стваральнік.

**4.** Растлумачце значэнне слоў, ужытых у тэксце, упісаўшы літару з правільным варыянтам адказу. Ёсць лішнія тлумачэнні.

**1) Ідэал____** **2) Муза____** **3) Геній____**

**А** – уяўленне пра найвышэйшае; найбольш дасканалы стан ці якасць чаго-небудзь.

**Б** – той, хто вылучаецца на атрыманне якой-небудзь прэміі.

**В** – асаблівы стан, звязаны з уздымам духоўных сіл, захапленнем і высокай прадуктыўнасцю, што спрыяе творчай дзейнасці.

**Г** – крыніца натхнення ці творчы дар.

**Д** – той, хто здольны да самастойнай творчасці і стварэння новага, што нельга вывучыць, а можна толькі адкрыць.

*(2 балы)*

**5.** Пазначце каля кожнага сцверджання *Праўда* ці *Няпраўда.*

| | Сцверджанне | Праўда | Няпраўда |
|---|---|---|---|
| **А** | Пераважная большасць карцін К.М. Чурлёніса прысвечана роднаму краю. | | |
| **Б** | Свет карцін К.М. Чурлёніса цёплы, прывабны, дыхае жыццём. | | |
| **В** | Геніяў умоўна можна падзяліць на тры тыпы. | | |
| **Г** | К.М. Чурлёніс крытычна ставіцца да свету. | | |
| **Д** | К.М. Чурлёніс у сваёй творчасці спалучае фарбы і гукі, колеры і штрыхі, рэальнасць і фантасмагорыю, мікракосм і макракосм. | | |
| **Е** | Мастацтва не вытрымала выпрабавання часам. | | |
| **Ё** | Касмічныя фантазіі К.М. Чурлёніса страцілі сваю мастацкую каштоўнасць. | | |

*(3 балы)*

**6.** А. Вярцінскі пісаў, што “прарочыя касмічныя фантазіі захоўваюць сваю мастацкую каштоўнасць…” Падбярыце два сінонімы да слова *каштоўнасць (у словазлучэнні мастацкую каштоўнасць)*

______________________________________________

*(1 бал)*

**7.** Што, паводле тэксту, з’яўляецца вызначальнай асаблівасцю творчага генія Чурлёніса?

______________________________________________

______________________________________________

*(1 бал)*

**8.** У чым, згодна тэксту, бачыць сваё прызначэнне Гётэ?

______________________________________________

*(1 бал)*

**9.** Як, згодна тэксту, ставяцца да свету Леанарда да Вінчы, Ван Гог, Леў Талстой?

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

*(1 бал)*

**10.** Якая з задум М.К. Чурлёніса, паводле тэксту, засталася да канца нявдзейсненай?

______________________________________________

*(1 бал)*

**11.** Вызначце жанры афіцыйна-дзелавога стылю. Адказ запішыце словам “так” або “не”.

**1)** Інструкцыя ________

**2)** Аўтабіяграфія ________

**3)** Гутарка ________

**4)** Заява на адпачынак ________

**5)** Нарыс ________

*(1 бал)*

**12.** У адпаведныя месцы ўпішыце назвы жанраў: *манаграфія, нататка, рэпартаж, даклад, дысертацыя, інтэрв’ю.*

| **1)** Навуковы стыль | **2)** Публіцыстычны стыль |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

*(2 балы)*

**13.** Да кожнага з 6 фразеалагізмаў знайдзіце сінанімічную пару, упісаўшы адпаведную літару.

| | |
|---|---|
| **1)** Разводзіць сырасць____ | **А** рваць на сабе валасы. |
| **2)** Распускаць рукі____ | **Б** выціскаць слязу. |
| **3)** Пасыпаць галаву попелам____ | **В** нуль без палачкі. |
| **4)** Пустое месца____ | **Г** лічыць рэбры. |
| **5)** Без задніх ног____ | **Д** няма дурных. |
| **6)** Нічога падобнга____ | **Е** як пшаніцу прадаўшы. |

*(3 балы)*

**Тэкст Б**

Н. Мацяш

Паводле карцін М. К. Чурлёніса

**Сяброўства**

Мне папраўдзе цябе нестае,
Непрысутнасць твая ёсць з найгоршых.
Падаю табе рукі свае
Разам з сонцам сяброўства ў прыгоршчах.

Бляск ягоны – адно паглядзі –
Нетру цемрадзі ўраз прасякае.
Аб'явіся, бліжэй падыдзі,
Сонца гэтак не апякае.

А дзівосна ярчэе, калі
Чыстай музыкай душаў стаецца.
Гэта холад чужання смыліць,
Каля самага сэрцайка ўецца...

Мне папраўдзе цябе нестае.

***Цішыня***

Ціха-ціха. У паветры ані веву.
Роўнядзь неба, як прасеяны падзол,
Аблягае ўчараваны
моўкны дол...

Ціха-ціха. Ні кузурынкі, ні птушкі.
Хто ўсе гукі сёння скраў, схаваў куды?
Ані ўсплёсінкі на роўнядзі вады,
Ані зыку хоць якой малое мушкі.

Што народзіць гэтай пругкай цішы ўлонне?

Дзесьці спяць якой навіны пасланцы?
Як сіроткі, ля вады тры дзьмухаўцы:
Ажно хочацца іх затуліць далонню...

**Дзень**

Ніяк не ўстаць.
Ніяк не распрастацца.
У невядомасць цягне, бы ў смалу.
Але ўпіліся ў край планеты пальцы,
Усходзіць галавы цяжкой валун!
А за спіною –
Дзень таго не бачыць, –
Хай бачаць тыя, хто сустрэне Дзень! –
Як тайны вырыс Космасу,
Маячыць
Светлая постаць –
Часу пільны цень.
Ляжыць зямля пустынная, нямая.
Стварэнню свету йсці ў каторы раз!..
Глядзіць нам проста ў вочы, не міргае,
З засцерагальна ўзнятым пальцам
ЧАС.

**Пытанні да тэксту Б**

**14.** Змест кожнага верша Н. Мацяш адпавядае сюжэту пэўнай карціны М. К. Чурлёніса. Падпішыце кожную з карцін назвай адпаведнага верша.





**1)**________________ **2)**________________ **3)**________________

*(1 бал)*

**15.** З кожнага верша Н. Мацяш выпішыце радкі, у якіх заключаецца яго галоўная думка.

**1)** *Верш* “*Сяброўства*”.

______________________________________

______________________________________

______________________________________

**2)** *Верш* “*Цішыня*”.

______________________________________

______________________________________

______________________________________

**3)** *Верш* “*Дзень*”.

______________________________________

______________________________________

______________________________________

*(3 балы)*

**16.** Назавіце, які выяўленчы сродак мовы выкарыстоўвае Н. Мацяш у наступных вершаваных радках:

*Гэта холад чужання смыліць,*
*Каля самага сэрцайка ўеецца...*

______________________________________

*(1 бал)*

**17.** З верша “Цішыня” выпішыце два параўнанні.

______________________________________

______________________________________

*(1 бал)*

**18.** Вызначце мастацкі сродак, ужыты Н. Мацяш у словазлучэнні *зямля пустынная, нямая.*

______________________________________

*(1 бал)*

**19.** Упішыце жанр, што адпавядае аўтару і назве твора: *апавяданне, драма, аповесць, паэма, камедыя, раман.*

**1)** Я. Купала. “Раскіданае гняздо“. ______________________________

**2)** М. Матукоўскі. “Мудрамер”. ______________________________

**3)** А. Гарун. “Пан Шабуневіч”. ______________________________

**4)** К. Чорны. “Лявон Бушмар”. ______________________________

**5)** І. Мележ. “Людзі на балоце”. ______________________________

**6)** Я. Колас. “Сымон-музыка”. ______________________________

*(3 балы)*

## RAŠTO DARBAS *(30 taškų)*

• **Выберыце адну з прапанаваных тэм і напішыце сачыненне-разважанне або інтэрпрэтацыю твора. Аб’ём пісьмовай работы – мінімум 300 слоў** (каля 2 старонак фармату А4). У чыставіку падлічыце словы, пазначце рыскай мяжу 300 і запішыце колькасць слоў на палях.

• **У сачыненні спасылайцеся як мінімум на два творы мастацкай літаратуры**. Хаця б адзін твор павінен быць з пералічаных у спісе для абавязковага чытання. (Спіс абавязковых для чытання твораў: *М. Гусоўскі.* “*Песня пра зубра*”, *В. Дунін-Марцінкевіч.* “*Пінская шляхта*”, *Ф. Багушэвіч.* “*Тралялёначка*”, *М. Багдановіч.* “*Апокрыф*”, *Цётка.* “*Успаміны з паездкі ў Фінляндыю*”, *А. Гарун.* “*Пан Шабуневіч*”, *Я. Купала.* “*Раскіданае гняздо*”, *Я. Колас.* “*У палескай глушы*”, *М. Гарэцкі.* “*У чым яго крыўда?* ”, *К. Чорны.* “*Лявон Бушмар*”, *І. Мележ.* “*Людзі на балоце*”, *К. Караткевіч.* “*Каласы пад сярпом тваім*”, *В. Быкаў.* “*Аблава*”, *С. Алексіевіч.* “*Чарнобыльская малітва*”, *А. Дудараў.* “*Князь Вітаўт*”.)

• **У інтэрпрэтацыі разгледзьце тэму, праблематыку, элементы паэтыкі тэксту** (з тлумачэннем іх функцыі).

• **У працы (як у сачыненні, так і ў інтэрпрэтацыі) спасылайцеся на выбраныя кантэксты** (напрыклад, літаратурныя, біяграфічныя, гістарычныя, сацыяльныя, культурныя).

## ТЭМЫ ПІСЬМОВЫХ РАБОТ

**1.** Ці дастаткова кахання, каб быць шчаслівым?

**2.** Чаму “васільком у жыце Беларушчыны назаўсёды застанецца Быкаў” (Р. Барадулін)?

**3.** Інтэрпрэтацыя верша Людмілы Рублеўскай *Род.* Сфармулюйце тэзіс інтэрпрэтацыі і абгрунтуйце яго.

## Тэкст для інтэрпрэтацыі

Людміла Рублеўская

### Род

Высокі род. Разбураны палац
Ці хата, што на тым жа самым месцы
Раз дзесяць будавалася.
Глядзяць
Праз вокны продкі,
А жыве там – вецер.
Род.
Кроў яго ўбірае, бы рака,
Дабро і зло і рысы вызначае,
З якімі сын твой будзе ці дачка
Жыць з ганьбаю, са славай ці звычайна.
Не выдумка блакітнае крыві,
А ісціна разумнае істоты –
Свой ведаць род і гонар радавы
І рушнікі захоўваць, і кляйноды[2].
У свеце адасобленых няма.
І ты – камень у бруку ці ў кароне.
Знайдзі свой герб.
І прадзеда імя
Успомні.

Людміла Рублеўская (нар. 5 ліпеня 1965) – беларуская паэтка, празаік, драматург, літаратурны крытык, перакладчыца, журналістка.

[2] Кляйнод (ад ням. kleinod – скарб. каштоўная рэч) – верхняя частка герба, атрыбут улады; уяўляе сабой упрыгожанне, якое размяшчаецца над каронай і нярэдка паўтарае гербавую выяву альбо яе элемент.

## JUODRAŠTIS